# ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКАЙ АДУКАВАНАСЦІ ІНТЭРАКТЫЎНЫМІ ГУЛЬНЯМІ



**МЯДЗВЕДСКАЯ ІНА МІКАЛАЕЎНА,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
**кваліфікацыйнай катэгорыі**
**«настаўнік-метадыст»,**
**фіналіст конкурса прафесійнага**
**майстэрства «Настаўнік года – 2020»,**
**член клуба «Крыштальны журавель»**

**Фарміраванне чытацкай адукаванасці**

# ПРАБЛЕМЫ

**Паглыбленне лексічнага запасу вучняў**

**Стварэнне ўмоў для папулярызацыі беларускай мовы**

**Фарміраванне спагадлівага, высакароднага чалавека, адукаванага суразмоўцы**

**Выхаванне сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь**

PowerPoint

# Магчымасці праграмы



# Тэхнічныя патрабаванні

Пры распрацоўцы гульняў былі выкарыстаны праграмныя сродкі Microsoft Word, Microsoft Power Point, Яндекс.Браузер, Paint.

Інтэрактыўныя гульні не прад’яўляюць да сістэмы асаблівых патрабаванняў і могуць функцыяніраваць на любых тыпах персанальных камп’ютараў.

# Інтэрактыўныя гульні

**Эфектыўнасць** (за кароткі прамежак часу можна якасна растлумачыць новую тэму, выявіць узровень ведаў)

**Паўтаральнасць** (можна выкарыстоўваць не адзін раз)

**Універсальнасць** (шырокае кола выкарыстання: на розных этапах урока, у розных класах)

Павышэнне **пазнавальнай актыўнасці** праз стварэнне гульнявой сітуацыі

Павышэнне цікавасці да **беларускай культуры**

Комплекс **па адной тэме**: знаёмства, замацаванне, тэст-кантроль

Магчымасць **аўтаматызаванага самакантролю** і больш аб'ектыўная ацэнка ведаў

**Не патрабуе спецыяльных камп'ютарных навыкаў** ад настаўніка і вучня


СВОЯ
игра
НТВ

# Свая гульня




## «Твая зямля, твая Радзіма названа, светлая - Беларусь!»

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Літаратурная спадчына | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Абрады і традыцыі | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Моўныя залацінкі | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Помнікі гісторыі і культуры | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |

# Літаратурная спадчына

*10 балаў*

Іван Торба, Ганна Крумкач, Кудзеснік, Карусь Лапаць, Лесавік, Марцін з-за рэчкі…

А пад якім псеўданімам яго вывучаюць на ўроках літаратуры?

*Якуб Колас*

# Літаратурная спадчына

**20 балаў**

**У перадсмяротны час герой дэтэктыўнай аповесці сказаў: *«Прадаў ты свой край, былы пабрацім. Але мы не памром. Мы яшчэ з'явімся да цябе, і да дзяцей тваіх, і да нашчадкаў тваіх, я і маё паляванне».***

**Пра якое паляванне ідзе гаворка?**

***«Дзікае паляванне караля Стаха»***

# Літаратурная спадчына

*30 балаў*

**Яго пахавалі двойчы: у студзені 1944 года на Кіраваградчыне і ў чэрвені 2003 года ў Мінску. Назавіце яго імя і прозвішча**

***Васіль Быкаў***

# Літаратурная спадчына

*40 балаў*

**Моцны ўплыў на фарміраванне асобы будучага пісьменніка зрабіў яго дзед, які прывіў унуку любоў да прыроды, вандраванняў, расказаў легенды пра Крычаўскае паўстанне 1743 – 1744 гг., пра вужыную каралеву, пра лебядзіны скіт, пра горад на дне возера і шмат пра што іншае. Гэтыя апавяданні сталі крыніцай для многіх будучых твораў пісьменніка, а сам дзед – прататыпам героя. Назавіце імя героя і твор, у якім можна яго сустрэць?**

***Даніла Загорскі-Вежа – «Каласы пад сярпом тваім»***

# Літаратурная спадчына

***50 балаў***

***Скажы мне, дзядзька, хоць шугала***
***Агнём Масква, ды каштавала***
***Французам страт яна.***
***Былі ж хвіліны баявыя,***
***Ды, кажуць, не абы-якія!***
***І помніць нездарма Расія***
***Пра дзень Барадзіна.***

**Назавіце імёны аўтара арыгінальнага твора і перакладчыка?**

***Міхаіл Лермантаў і Аркадзь Куляшоў***

# Абрады і традыцыі

*10 балаў*

**Глыбока чалавечны і высакародны звычай аказання дапамогі вяскоўцам, якія па розных прычынах не маглі ўправіцца сваімі сіламі, уласнымі намаганнямі называецца…**

***Талака***

# Абрады і традыцыі

*20 балаў*

**Будаўніцтва хаты пачыналі толькі пасля Благавешчання. Месца выбіралі наступным чынам: за некалькі дзён да будаўніцтва кідалі на зямлю дубовую кару і прыкладна на чацвёрты дзень падымалі яе. Калі там знаходзілі іх, лічылі, што такое месца найбольш спрыяе для будаўніцтва, а калі пад карой заводзіліся павукі ці звычайныя мурашкі, шукалі другое месца.**

**Знаходжанне якіх істот спрыла будаўніцтву хаты?**

***Чарвякоў ці чорных мурашак***

# Абрады і традыцыі

**30 балаў**

**У гэты дзень на стол засцілалі белы абрус, ставілі на цэнтр стала каравай або хлеб, сыр, боршч, кіслае малако і іншыя стравы, залежнасці ад дастатку сям'і.**

**Пасля абеду гаспадыня апраналася ў святочнае адзенне, брала з сабою кавалак каравая са стала, соль, сыр, грамнічную свечку і ішла …**

**Куды ішла жанчына?**

***Зажынаць жыта***

# Абрады і традыцыі

***40 балаў***

**Якая традыцыя існавала пры выбары масці кароў?**

***Колер валасоў у гаспадара***

# Абрады і традыцыі

*50 балаў*

**Скарач – невялікі ручнік утылітарнага прызначэння, выраблены з невялікага кавалка тканіны і канцоў нітак асновы, якія ў працэсе ткання нельга заткаць. Гэтыя ніткі скручваліся ў вяровачкі, нескладана перапляталіся ў сетку. Скарач ніколі не ткалі асобным вырабам, а адразалі ад гатовага палатна. Гэтым ручнікам выцiралі посуд, рукі.**

**Якую ролю, акрамя названай, адыгрываў гэты ручнік у сялянскай сям'і?**

***Выхаваўчую ролю: «на «скорую» руку білі дзяцей»***

# Моўныя залацінкі

*10 балаў*

**Назавіце па-беларуску ажурна-сеткавы выраб для аздаблення бялізны, сурвэтак, абрусаў, ручнікоў.**



*Карункі*

# Моўныя залацінкі

*20 балаў*

**Перакладзіце на беларускую мову слова «дебоширить».**

***Скандаліць, буяніць***

# Моўныя залацінкі

*30 балаў*

**Які дзень тыдня ўтварыўся ад старажытнаяўрэйскага «шабаш»?**

***Субота (‘самавольнае заканчэнне работы’)***

# Моўныя залацінкі

**40 балаў**

**АтрАмант – устарэлае слова. Якое слова мы выкарыстоўваем замест яго цяпер?**



***Чарніла***

# Моўныя залацінкі

**50 балаў**

**Якую фарбу трэба ўзяць, каб намаляваць «жытнічкаў»?**



***Сінюю, блакітную, фіялетавую***

# Скарбы гісторыі і культуры

*10 балаў*

**У пачатку 70-х гадоў іх называлі «Лявоны». А як іх завуць цяпер?**



# Скарбы гісторыі і культуры

***20 балаў***

**Аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь Уладзімір Іванавіч Карызна выкарыстаў фрагменты тэксту гімна БССР. Хто быў яго аўтарам?**



***Міхаіл (Міхась) Клімковіч***

# Скарбы гісторыі і культуры

**30 балаў**

**Мастаку з Брэста Мікалаю Кузьмічу спатрэбілася 5 год, кіпарыс з Ерусаліма, паўтысячы жамчужын, кроплі крыві Гасподняй і шмат іншага, каб яшчэ раз ажыццявіць задуму…**

**А чыю задуму?**

***Лазара Богшы***





# Скарбы гісторыі і культуры

**40 балаў**










На рацэ ўзбярэжжах
Гарадок далёкі,
Хоць і цесна ў межах,
Марай быў – шырокі.
Ён назваў дасціпна,
Выдумкай багаты,
Можа і нясціпла
Нашы інтэрнаты.
Стаў адзін Парыжам,
А другі – Версалем,
На здзіўленне хіжым
Еўрапейскім далям.

*А. Куляшоў*

**Назавіце раку і горад, на тэрыторыі якога знаходзяцца будынкі Лондан, Версаль і Парыж.**

***Рака Віхра, горад Мсціслаў***

# Скарбы гісторыі і культуры

50 балаў

**Сакаленне, гаптаванне, рошвы, абкіданне, перавіць, слань – гэтыя старадаўнія віды вышыўкі, у адрозненне ад крыжыка, набора, гладзі, захаваліся ў адзінкавых экзэмплярах. Чаму?**

***Ажурныя страчавыя швы выконвалі на дробнай сетцы, таму тканіна хутчэй утылізіравалася***

На Каляды калядуйце!
Піць і есці не шкадуйце!
Шчадруйце, шаноўныя!
Жывіце год да ста так!
Хай едзе ў вашы дворы
Прыбытак і дастатак!